кі свет і жыццё шырока адкрыліся звычайнаму чалавеку, душа яго для іх закрылася". Чалавек мас, чалавек "прамога дзеяння", а не для дыскусій. Такі чалавек не прымае апазіцый. Чалавек мас жыве лепш у параўнанні са сваімі папярэднікамі, але ён – прымітыў, першабытны чалавек у цывілізаваным свеце, варвар. Бальшавізм і фашызм, на думку Х.Артэга-і-Гасета, – два яркія прыклады рэгрэсу.

Такім чынам, узаемасувязь каштоўнасцей грамадства і каштоўнасцей асобы ў экзістэнцыяльнай філасофіі тлумачыцца не толькі традыцыямі.

## КАМПЛЕКТАВАННЕ І ВЫКАРЫСТАННЕ ФОНДАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў МАСАВЫХ БІБЛІЯТЭКАХ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

І.М.Стрыжонак

З пашырэннем беларускай мовы і набыццём ёю статуса дзяржаўнай мяняецца моўная структура фондаў масавых бібліятэк рэспублікі на карысць беларускамоўных публікацый. Колькасныя і якасныя змены ў фондах масавых бібліятэк цесна звязаны з развіццём кнігавыдання на беларускай мове. Аналіз структуры кнігавыдання на беларускай мове за 10 гадоў (1978-1988 гг.) паказаў, што асноўны прырост прыйшоўся на мастацкую і дзіцячую літаратуру і склаў адпаведна па назвам 14,6% і 12,3%, па тыражам – 35,9% і 29,6%. У той жа час скараціўся выпуск вучэбнай і галіновай літаратуры адпаведна на 20,6% і 1,1% па назвам, па тыражам на 15,3 і 36,4%. Навіраўся даволі высокі тэмп росту выпуску беларускай літаратуры на рускай і замежных мовах, таму удзельная вага выданняў на беларускай мове ў агульным выпуску за 10 гадоў знізілася з 64,5% да 44%. І толькі ў апошнія гады (з 1989 г.) пачалося павялічэнне часткі беларускай літаратуры на нацыянальнай мове ў агульным аб'ёме кнігавыдання.

У публічных масавых бібліятэках Беларусі рэспубліканскія выданні складаюць па назвах да 17%, а па экзэмплярнасці да 30% ад агульнага аб'ёма фондаў. У масавых бібліятэках Мінскай воб-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ласці знаходзіцца каля 3-х мільенаў экземпляраў кніг на беларускай мове, што складае 17,6% агульнага фонда. Большая частка гэтай літаратуры – беларуская мастацкая літаратура. Кнігавыдача літаратуры на беларускай мове склала 14,8%, чытальнасць – 3,1, кнігазабяспечаннасць – 3,4, абарачальнасць фонду – 0,9. Існуюць адпаведныя асаблівасці ў камплектаванні і выкарыстанні фондаў беларускай літаратуры ў кожным раёне вобласці. У бібліятэках Уздзенскага раена беларуская літаратура у 1990 годзе склала 18,2% (у 1987 г. – 17,6%) ад агульнага фонда, кнігавыдача беларускай літаратуры узрасла да 17,2% (у 1987 г. – 16,6%), кнігазабяспечаннасць склала 4 (1987 г. – 3,8). Гэта вынікі пленнай дзейнасці бібліятэкараў па прапагандзе беларускай літаратуры. Акрамя таго, Уздзенскі раен багаты нацыянальнымі традыцыямі, тут нарадзіліся "уздзенскія вячоркі", "экалагічныя вечарыны", самадзейныя літаратурныя і краязнаўчыя таварыствы. У бібліятэках раена гучыць беларуская мова. Цэнтральная раённая бібліятэка імя Паулюка Труса дапамагае сельскім бібліятэкам-філіялам у арганізацыі работы з нацыянальнай літаратурай.

У Валожынскай ЦБС існуе добрая адпаведнасць паміж колькасцю назваў у фондзе беларускай літаратуры і ступенню яе выкарыстання: у 1987 г. фонд беларускай літаратуры склаў 22,4%, кнігавыдача – 23,5%, у 1990 г. фонд – 22,5%, кнігавыдача – 24,4%. Узраслі паказчыкі бібліятэчнай статыстыкі па выкарыстанню беларускай літаратуры і ў Мінскім раене: кнігавыдача склала у 1990г. 22,7% (1987 г. – 17,0%), чытальнасць павялічылася з 3,4 у 1987г. да 4,2 у 1990 г., абарачальнасць фонду у 1990 г. склала – 1 (1987 г. – 0,8).

Рэалізацыя праграм "Родная мова" і "Спадчына" у бібліятэках высвятліла шматлікія недахопы у іх дзейнасці па камплектаванню фондаў беларускай літаратуры і арганізацыі яе карыстання. З аднаго боку, большая частка беларускай літаратуры наогул не запытваецца чытачамі, з другога боку, у бібліятэках не хапае літаратуры на беларускай мове – гэта слоўнікі, падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, дзіцячая, гістарычная, літаратура па экалогіі. Мала і мастацкай літаратуры на роднай мове (да 12,0%), а вось у перакладзе на рускую мову да 68%. Акрамя таго, калі па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раўнаць опіс аўтараў, творы якіх даволі шырока выдаваліся на беларускай мове ў 1978-1988 гг. са спісам беларускіх пісьменнікаў, творы якіх найбольш часта запытваюцца чытачамі бібліятэк Мінскай вобласці, то добра відаць, што чытачу цяжка знайсці ў бібліятэках цікавыя для яго творы С.Алексіевіч, М.Гарчыка, А.Адамовіча, В.Карпава, А.Васілевіч, А.Савіцкага і іншых. Творы гэтых аўтараў выдаваліся зрэдку і невялікімі тыражамі. Такім чынам, трэба прывесці ў адпаведнасць структуру выдання літаратуры са структурай чытацкага запыта.

Каб пераадоліць недахопы трэба звярнуць увагу на удасканаленне наступных напрамкаў дзейнасці: правядзенне аналізу фонда беларускай літаратуры і забяспячэнне яе дакамплектавання; удасканаленне работы з тэмпланамі беларускіх выдавецтваў; сістэматычнае вывучэнне запытаў чытачоў на літаратуру; выкарыстанне новых форм і метадаў прапаганды беларускай кнігі; цеснае узаемадзеянне бібліятэк з іншымі культурна-асветніцкімі установамі і г.д.

Вырашэнне гэтых праблем дапаможа бібліятэкам стаць сапраўдным асяродзем нацыянальнай культуры, дазволіць усялякі садзейнічаць адраджэнню культурнай спадчыны і захаванню нацыянальнай памяці народаў Беларусі.

## ВЫДАННЕ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА БЕЛАРУСІ: СУЧАСНЫ СТАН, ПЕРСПЕКТЫВЫ

Т.К.Кобер (аспірантка)

На Беларусі выдавецкай дзейнасцю для дзяцей займаецца ў асноўным "Юнацтва". Штогод яно выпускае звыш 150 назваў агульным тыражом 10 млн.экз. Гэта мастацкая, навукова-пазнавальная, даведачная літаратура. 85% рапертуара выдавецтва аддаецца дзіцячым бібліятэкам. Але, на жаль, у дзейнасці "Юнацтва", як у люстэрку, бачныя недахопы выдавецкай справы былога СССР.

Калі прааналізаваць статыстычныя даныя выхаду літаратуры для дзяцей у свет (кл."Друк БССР" за 1985-1990 гг.), атрымаецца сумная карціна. Нестабільнасць у грамадстве, разбалансава-